Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## РАМАНАЎ Барыс Дзмітрыевіч

# РАМАНАЎ
# Барыс Дзмітрыевіч

**(15.04.1924 - 07.08.1980)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Раманаў Барыс Дзмітрыевіч - камандзір гарматы 755-га стралковага палка (217-я стралковая дывізія, 48-я армія, 1-ы Беларускі фронт), сяржант.**

**Нарадзіўся 15 красавіка 1924 года ў сяле Палатняны Завод, цяпер пасёлак гарадскога тыпу Дзяржынскага раёна Калужскай вобласці, у сям'і рабочага. Рускі. Член ВКП(б)/КПСС з 1944 года. Скончыў сямігадовую школу. Вучыўся ў Калужскім педагагічным вучылішчы. З кастрычніка 1941 года па студзень 1942 года знаходзіўся на акупаванай тэрыторыі.**

**У сакавіку 1942 года прызваны ў Чырвоную Армію і накіраваны на фронт мінамётчыкам 755-га стралковага палка 217-й стралковай дывізіі. У складзе 49-й і 16-й (з мая 1943 года - 11-й**

гвардзейскай) армій Заходняга фронту да лета 1943 года ўдзельнічаў у баях на павеце кірунку.

25 жніўня 1942 года чырвонаармеец Раманаў ў складзе разліку падтрымліваў пераправу стралковага батальёна праз раку Жыздра ў баі за вёску Грэтна (цяпер - Сухінчскі раён Калужскай вобласці). Калі выйшаў са строю камандзір разліку, Раманаў замяніў яго і мінамётным агнём знішчыў чатыры кулямётныя кропкі праціўніка, што дало магчымасць батальёну бесперашкодна пераправіцца на правы бераг ракі і авалодаць населеным пунктам. У лютым 1943 года за гэты бой ён атрымаў сваю першую ўзнагароду - медаль «За баявыя заслугі».

У ліпені-жніўні 1943 года ўдзельнічаў у Арлоўскай наступальнай аперацыі, у якой часцямі арміі (з 30 ліпеня ў складзе Бранскага фронту) была блакіравана і знішчана болхаўская групоўка праціўніка. У верасні 1943 года 217-я стралковая дывізія была перададзена 11-й арміі і вызваляла гарады Бранск, Почап, Унеча (абодва - Бранская вобласць), Гомель, фарсіравала рэкі Дзясна, Сож, Днепр.

З снежня 1943 года - у складзе 48-й арміі Беларускага (з лютага 1944-га - 1-га Беларускага) фронту. Падчас правядзення Беларускай аперацыі армія, наступаючы на бабруйскім напрамку,

вызваліла горад Жлобін (Гомельская вобласць), а затым удзельнічала ў разгроме групоўцы праціўніка, акружанай ў раёне Бабруйска (Магілёўская вобласць) і вызваленні гэтага горада.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 жніўня 1944 года за мужнасць, адвагу і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, сяржанту Раманаву Барысу Дзмітрыевічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая Звязда». У далейшым Б.Д. Раманаў ўдзельнічаў у знішчэнні баранавіцкай групоўкі гітлераўцаў, вызваленні Польшчы, баях ва Усходняй Прусіі.

У 1947 годзе ён скончыў Саратаўскае танкавае вучылішча, у 1956 годзе - Курсы ўдасканалення афіцэрскага складу.

З 1962 году капітан Раманаў - у запасе. Жыў у Калузе, працаваў старшым інжынерам на машынабудаўнічым заводзе.

Памёр 7 жніўня 1980 года.

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

30 чэрвеня 1944 года ў раёне вёскі Малая Гарожа (Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласці) на пазіцыі стралковай роты 755-га стралковага палка, у баявых парадках якой знаходзіўся са сваім разлікам камандзір гарматы сяржант Раманаў, выйшла ўдарная група гітлераўцаў колькасцю да 800 чалавек пры падтрымцы танкаў і бронемашын, якая спрабавала вырвацца з Бабруйскага “катла”.

Раманаў выкаціў гармату на адкрытую пазіцыю і, вядучы агонь прамой наводкай, падбіў два танкі, чатыры бронетранспарцёры, адну аўтамашыну і дзве падводы з маёмасцю, знішчыўшы пры гэтым да 100 нямецкіх салдат і афіцэраў. Калі ў ходзе бою паўстала пагроза акружэння гарматы, разлік на чале з камандзірам ўступіў у рукапашную схватку і знішчыў 15 немцаў. Траіх асабіста забіў Б.Д. Раманаў. Дзякуючы ўмелым дзеянням разліку гарматы сяржанта Раманава праціўніку не ўдалося вырвацца з акружэння, 50 гітлераўцаў здаліся ў палон.

22 жніўня 1944 года за мужнасць, адвагу і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, сяржанту Раманаву Барысу Дзмітрыевічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза

# ЛІТАРАТУРА


1. Романов Борис Дмитриевич – Герой Советского Союза, командир противотанкового орудия, отличился у д.Малая Горожа // Навечно в сердце народном. -- Мн., 1984. -- С.439--440.

2. Романов Б.Д. // Герои Советского Союза : краткий биограф.словарь. В 2т. Т.2. -- Мн., 1987. -- С.368.

3. Романов Борис Дмитриевич[Электронный ресурс] / Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа :http://www.warheroes.ru